# § 23. Пачатак кіравання Раманавых

1613 г. 1649 г. 1654 г. 1670—1671 гг.

**Успомніце.** *Якія асноўныя прыкметы абсалютызму? Якое значэнне ў кіраванні Расійскай дзяржавай мелі Баярская дума і Земскі сабор? З якой мэтай Іван Грозны заснаваў прыказы?*

З прыходам да ўлады дынастыі Раманавых пачалася эпоха росквіту Расійскай дзяржавы. Наступствы Смуты былі пераадоленыя, замежныя інтэрвенты выгнаныя. На троне ўмацоўвалася новая дынастыя.

**Вы даведаецеся.** *Якія змены ў кіраванні краінай адбываліся ў Расіі ў XVII ст. Як Расійская дзяржава аднаўлялася пасля Смуты. Што змянілася ў становішчы рускіх сялян.*

220—222

**1. Узыходжанне на трон дынастыі Раманавых.** Краіна мела патрэбу ў адзінстве. Неабходны быў новы цар, якога б падтрымаў увесь народ. Гэта добра разумелі арганізатары апалчэння. Па ўсёй краіне разаслалі граматы, у якіх загадвалася накіраваць у Маскву выбарных асоб ад дваран, гараджан, чарнасошных сялян, казакаў і іншых груп насельніцтва.



Міхаіл Фёдаравіч. Дэпутацыя ад Земскага сабора. Мастак *Аляксей Кіўшэнка*. 1880 г.

У ***1613 г.*** для выбрання рускага цара быў скліканы Земскі сабор. На рускі трон прэтэндавалі прадстаўнікі не толькі мясцовай шляхты, але і кіруючых дынастый суседніх краін. У ходзе бурных абмеркаванняў сабор адхіліў кандыдатуры польскага каралевіча, шведскага прынца і сына імператара

Свяшчэннай Рымскай імперыі. Перавага была аддадзена 16-гадоваму ***Міхаілу Фёдаравічу Раманаву***, выхадцу са славутага баярскага роду, які знаходзіўся ў сваяцтве з Іванам Грозным. Акрамя таго, яго бацькам быў патрыярх Філарэт — вядомы царкоўны і палітычны дзеяч Смутнага часу. Абраны цар прыняў умову сабора чыніць справы, радзячыся «з усёй зямлёй», гэта значыць з Земскім саборам і Баярскаю думай.

*Як вы лічыце, чаму перавагу аддалі Міхаілу Фёдаравічу?*

Пасля смерці Міхаіла Фёдаравіча Раманава ў 1645 г. трон атрымаў у спадчыну яго 16-гадовы сын Аляксей. Паступова Аляксей Міхайлавіч уключыўся ў дзяржаўныя справы і праявіў сябе дальнабачным і цвёрдым, а часам і бязлітасным палітыкам.



218—219

Цар Аляксей Міхайлавіч. Парсуна XVII ст.

Падчас яго кіравання ўплыў Баярскай думы паступова змяншаўся, а саборы пасля 1653 г. і зусім не склікаліся. Такім чынам, Аляксей Міхайлавіч умацоўваў самадзяржаўную ўладу. Асноўным апірышчам яе сталі дзяржаўны апарат і армія, а галоўным звяном апарату кіравання — прыказы. Самым важным лічыўся Разрадны прыказ, які прызначаў дваран на гасудараву службу. Прыказы няўхільна выконвалі волю цара. У гэты ж час пачалі стварацца палкі «новага строю». Салдаты навучаліся вайсковай справе і атрымоўвалі аднолькавае ўзбраенне.

**З успамінаў сучасніка-англічаніна**

«Двор маскоўскага гасудара такі прыгожы і трымаецца ў такім парадку, што між усіх хрысціянскіх манархаў наўрад ці ёсць адзін, які б пераўзыходзіў у гэтым маскоўскі. Усё засяроджана вакол двара. Падданыя, аслепленыя яго бляскам, навучаюцца тым больш ганараваць цара і шануюць яго амаль нароўні з Богам».

*Двор якога еўрапейскага манарха нагадвае двор Аляксея Міхайлавіча? Якія агульныя рысы ў іх назіраюцца?*

Яшчэ адной важнай падзеяй эпохі стала рэформа Рускай праваслаўнай царквы. Ініцыятарам рэформы, якая пачалася ў 1650-х гг., быў патрыярх Нікан. Яго падтрымаў цар Аляксей Міхайлавіч. Яны вырашылі перарабіць царкву на ўзор грэчаскай. Былі ўведзеныя новыя абрады і богаслужбовыя кнігі. Нікан аддаў анафеме двухперсце, абавязаўшы вернікаў хрысціцца трыма перстамі (пальцамі). Ніканаўскія новаўвядзенні ўнеслі раскол у Рускую праваслаўную царкву. У 1667 г. паслядоўнікі старой веры былі адлучаны ад царквы. Крыху пазней іх сталі называць старавераммі.

**2. Пераадоленне наступстваў Смуты.** Навядзенне парадку ў дзяржаве пасля Смуты дабратворна адбілася на эканоміцы краіны. У гарадах і вёсках развіваліся рамёствы. З’явіліся лішкі прадуктаў, якія ішлі на продаж. І памешчыкі, і сяляне пастаўлялі сельскагаспадарчую прадукцыю на рынак, каб атрымаць за яе грошы.

У XVII ст. на змену рамесным майстэрням прыйшла новая форма вытворчасці — мануфактура. Уладальнікамі мануфактур выступалі дзяржава, замежныя і айчынныя купцы, буйны`яфеадалы і царскі двор. Яны сталі гвалтоўна прымацоўваць да прадпрыемства прыгонных. У Расіі да канца стагоддзя налічвалася каля трыццаці буйны`хмануфактур. Найбольш знакамітыя былі металургічныя заводы на Урале, гарбарныя мануфактуры ў гарадах Яраслаўлі і Ніжнім Ноўгарадзе, саляварныя — у Прыкам’і і горадзе Старая Руса.

*Чым расійскія мануфактуры адрозніваліся ад заходнееўрапейскіх?*



Масква напрыканцы XVII ст. Мастак *Апалінарый Васняцоў*. 1922 г.

*Якія дэталі карціны сведчаць пра тое, што Расія перажывала эканамічны ўздым?*

Развіваўся і знешні гандаль. З краінамі Заходняй Еўропы асноўны гандаль вёўся праз горад Архангельск, з усходнімі — праз Астрахань. Расія яшчэ не мела марскога флоту, таму знешні гандаль знаходзіўся ў руках заморскіх купцоў, што скуплялі па нізкіх коштах лес, футра, воск, дзёгаць, пяньку і інш.

**3. Узмацненне прыгонніцтва.** На працягу XVII ст. царская ўлада намагалася заручыцца падтрымкаю дваранства. У якасці ўзнагароды яна перадавала дваранам дзяржаўныя землі з сялянамі. На сялян цяжкім грузам ляглі паншчына і аброк феадалам, падаткі і шматлікія павіннасці дзяржаве. Атрымоўваючы землі ў карыстанне, дваране настойвалі, каб іх зрабілі вотчыннікамі, то-бок спадчыннымі ўладальнікамі гэтых зямель.

Земскі сабор у 1649 г. прыняў звод законаў — Саборнае ўлажэнне. Улажэнне канчаткова афарміла ў Расіі прыгоннае права: сістэма Юр'ева дня скасоўвалася, устанаўліваўся бестэрміновы вышук збеглых сялян. Сяляне цяпер назаўсёды рабіліся ўласнасцю феадала і перадаваліся разам з зямлёй у спадчыну або прадаваліся разам з зямлёй.

215—216

*Як называецца такая форма залежнасці сялян? Ці захоўвалася яна ў сярэдзіне XVII ст. у вядучых еўрапейскіх дзяржавах?*

**4. Паўстанне Сцяпана Разіна.** Нярэдка сяляне ў пошуках волі ўцякалі на ўскраіны Расіі, знаходзілі прытулак на Доне, на Урале і ў Сібіры. Асабліва шмат збеглых з'явілася на рацэ Дон. Там не было прыгоннага права, і сярод вольнага казацтва дзейнічала правіла: «З Дону выдачы няма». У 1667 г. казачы атаман ***Сцяпан Разін*** набраў атрад «галоты» (бяднейшае казацтва) і здзейсніў паходы на рэкі Волгу і Яік і ў Персію (цяпер Іран). З багатаю здабычай ён вярнуўся на Дон. Слава пра Разіна разышлася па ўсёй Расіі.



Сцяпан Разін. Гравюра *Паўля Фюрста*. 1670 г.

У 1670 г. Разін стаў на чале вялікага войска і захапіў гарады Астрахань і Царыцын. Паўстанцы рушылі ўверх па Волзе. У выніку паўстанне пашырылася на ўсё Паволжа.

217 Па краіне рассылаліся «спакусныя» лісты, якія заклікалі («спакушалі») знішчаць баяр, ваявод і прыказны люд. Паўстанне набыло антыфеадальны характар. Сяляне паўсюль грамілі сядзібы, забівалі памешчыкаў. Да іх далучыліся атрады татар, чувашоў і мардвы. Але ўжо ўвосень 1670 г. Разін пацярпеў сур'ёзнае паражэнне ля горада Сімбірска. Крыху пазней ён быў схоплены казачай вярхушкай, выдадзены ўладам і пакараны смерцю на Балотнай плошчы ў Маскве. Да лета 1671 г. былі задушаны апошнія ачагі паўстання.

**5. Пашырэнне тэрыторыі Расіі.** Асноўнымі задачамі знешняй палітыкі Расіі ў XVII ст. былі ўмацаванне міжнароднага становішча краіны і ліквідацыя наступстваў Смуты.




| | |
|---|---|
| МАСКВА | Сталіцы дзяржаў |
| Полацк | Іншыя населеныя пункты |
| Албазін 1651 | Новыя расійскія паселішчы, астрогі (з датамі заснавання) |
| | ТЭРЫТОРЫІ |
| | Расійскага царства да 1618 г. |
| | далучаныя да Расіі ў 1619–1689 гг. |
| | якія адышлі да Кітая паводле Нерчынскай дамовы 1689 г. |
| | не размежаваныя паводле Нерчынскай дамовы |
| | Граніцы Расійскага царства да 1689 г. |
| | Шлях перасялення калмыкаў |
| якуты | Народнасці, плямёны |
| | МАРШРУТЫ ЭКСПЕДЫЦЫЙ |
| | М. Васільеў (1628) |
| | В. Паяркаў (1643–1646) |
| | Ф. Аляксееў (Папоў) і С. Дзяжнёў (1648–1649) |
| | Е. Хабараў (1649–1651) |
| | У. Атласаў (1697–1699) |

Пашырэнне тэрыторыі Расіі

У 1611 г. Швецыя, скарыстаўшыся Смутай, захапіла наўгародскія землі. Расія вярнула гэтыя землі згодна з мірнай дамовай 1617 г. Але шэраг рускіх гарадоў застаўся за Швецыяй, у выніку чаго Расія на 100 гадоў страціла выхад да Балтыйскага мора.

Важнай падзеяй пачатку кіравання Раманавых стала далучэнне да Расіі Левабярэжнай Украіны ў 1654 г. Гэта зрабілася мажлівым у выніку казацка-сялянскай вайны пад кіраўніцтвам Багдана Хмяльніцкага. Уваходжанне Украіны ў склад Расіі прывяло да вайны з Рэччу Паспалітай. Вайна для Расіі была паспяховай, і яна вярнула сабе Смаленскую і Чарнігава-Северскую землі, страчаныя падчас Смуты.

У першай палове XVII ст. пачалося асваенне і далучэнне Усходняй Сібіры. Рускія выйшлі да Ціхага акіяна. Суседам Расіі зрабілася найбуйнейшая дзяржава Азіі — Кітай.

*Такім чынам, у XVII ст. пры першых Раманавых у Расіі былі ліквідаваныя адмоўныя наступствы Смутнага часу. Умацавалася самадзяржаўная царская ўлада, працягвалася імклівае пашырэнне Расійскай дзяржавы ва ўсходнім кірунку.*

***Ключавыя словы:*** *Міхаіл Фёдаравіч Раманаў, Аляксей Міхайлавіч, Сцяпан Разін, прыгоннае права, Саборнае ўлажэнне.*

**Пытанні і заданні**

**1.** Якім чынам у Расійскай дзяржаве пачала панаваць дынастыя Раманавых?
**2.** Якія змены ў дзяржаўным кіраванні Расіі сведчаць пра фарміраванне абсалютнай манархіі?
**3.** Прывядзіце доказы пераадолення наступстваў Смуты ў эканоміцы краіны.
**4.** Што такое прыгоннае права? Які дакумент канчаткова запрыгоніў рускіх сялян? Якія факты сведчаць пра гэта?
**5.** Складзіце расказ пра паўстанне Сцяпана Разіна па наступным плане: а) прычыны паўстання; б) асноўныя ўдзельнікі; в) ход падзей; г) вынік паўстання. Падумайце, чаму гэтае паўстанне пацярпела паражэнне.
**6.** Якія знешнепалітычныя задачы стаялі перад Расіяй у XVII ст.? Як гэтыя задачы вырашаліся?
**7.** Чаму XVII ст. у гісторыі Расіі называюць «бунташным векам»?